# Свята духоўнасці

**У Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага 1 верасня адкрыецца выстава пад назвай «Свята беларускага слова — свята духоўнасці і адраджэння», прысвечаная Дню беларускай пісьменнасці. Аб гэтым паведаміла загадчык аддзела краязнаўства Любоў Турмасава.**

Выданні прадстаўлены ў двух раздзелах. Першы прысвечаны гісторыі кнігадрукавання на Гродзеншчыне. Гэта кнігі А. Пяткевіча аб гісторыі друку ў Гродне, зборнік матэрыялаў «Гарадзенскія чытанні», фотаальбом першых беларускіх сродкаў інфармацыі, выданні пра сучасную журналістыку на Гродзеншчыне А. Богуша, раздрукоўкі газет «Авізы Гродзеньске», «Газета Гродзеньска», «Мужыцкая праўда». Другі раздзел прысвечаны гарадам Гродзеншчыны, дзе адзначалі Дзень беларускай пісьменнасці. Тут экспануюцца кнігі «Мірскі замак», «Смаргонь», «Колькі ў небе зор», зборнік «Навагрудскія чытанні», «Беларускі гістарычны часопіс» і іншыя.

Першапачаткова дата свята была прывязана да дня выдання першай друкаванай беларускай кнігі — 6 жніўня 1517 года, і толькі з 1998 года Дзень беларускай пісьменнасці пачалі адзначаць у першую нядзелю верасня.

У гэтым годзе традыцыйны фестываль беларускага друкаванага слова і культуры адбудзецца ў горадзе Быхаве Магілёўскай вобласці, а святочныя мерапрыемствы пройдуць па ўсёй рэспубліцы.

**Аксана САВАШЫНСКАЯ.**